ческих и технологических факторов в период воспитания данного поколения существуют определенные специфические особенности формирования их социального интеллекта, посредством которого происходит взаимодействие с окружающим миром.

1. *Разумникова, О. М.* Современные представления о социальном интеллекте и социальной креативности: значение тормозных функций в социальной адаптации [Электронный ресурс] / О. М. Разумникова, М. В. Пусикова // Теоретическая и экспериментальная психология. – 2018. – № 1. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/sovremennye-predstavleniya-o-sotsialnom-intellekte-i-sotsialnoy-kreativnosti-znachenie-tormoznyh-funktsiy-v-sotsialnoy-adaptatsii. – Дата доступа: 31.03.2023.

2. *Lolarga, J.* Millennials vs Gen Z: Understanding generational preferences & their motivations [Electronic resource] / Jacob Lolarga. – Mode of access: https://www.linkedin.com/pulse/millennials-vs-gen-z-understanding-generational-jacob-lolarga. – Date of access: 28.01.2023.

3. Reforming the United Nations for Peace and Security [Electronic resource] // Yale Center for the Study of Globalization. – New Haven : Connecticut, 2005. – Mode of access: http://www.ycsg.yale.edu/core/forms/Reforming_un.pdf. – Date of access: 20.02.2023.

4. *Swanzen, R.* Facing the generation chasm: the parenting and teaching of generations Y and Z / R. Swanzen // International Journal of Child, Youth and Family Studies. – 2018. – P. 125–150.

**В. В. Навіцкая,** *саіскальнік*
*вучонай ступені кандыдата навук*
*установы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў».*
Навуковы кіраўнік – **Я. Л. Краснова,**
*кандыдат культуралогіі,*
*дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны*
*ўстановы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў»*

# ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ ЯК ПРАСТОРА АКТУАЛІЗАЦЫІ КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ

На сучасным этапе развіцця нашага грамадства гістарычным музеям адводзіцца асаблівая роля па фарміраванні патрыя-

тызму, грамадзянскай самасвядомасці і высокай маральнасці як адным з умоў далейшага грамадскага прагрэсу. Стрыжнем такіх музеяў выступае гісторыя, праз якую адбываецца разгляд з’яў і прадметаў у іх узаемасувязі, ацэнка з’яў і прадметаў з пункту гледжання іх месца ў агульнагістарычным, цывілізацыйным працэсе, вывучэнне гісторыі ў святле сучаснасці.

У сацыяльна-культурных адносінах гістарычны музей аналізуецца на розных узроўнях: камунікатыўным, матэрыяльным, прасторавым, дыскурсіўным, на ўзроўні аўтараў, на ўзроўні рэпрэзентацыі. Музейныя аб’екты становяцца значным элементам аналізу музеялізацыі, яны выступаюць фрагментамі мінулага. Толькі з дапамогай інсцэніроўкі і кантэкстуалізацыі ў музейнай прасторы яны набываюць спецыфічныя ўласцівасці, адлюстроўваючы знакі і сувязь з мінулым. Акрамя гэтага, гістарычны музей рэалізуе палітычны дыскурс аб мінулым, паколькі з’яўляецца месцам яго інтэрпрэтацыі. Змяненні ва ўзаемаадносінах грамадства з яго калектыўнай памяццю адлюстроўваюцца ў праблематыцы гістарычных музеяў.

Культурна-гістарычная памяць грамадства прадстаўляецца складаным феноменам, які непасрэдна звязаны з сацыяльнай бяспекай, нацыянальнай ідэнтычнасцю і здольнасцю да адказу на ўзнікаючыя выклікі. Сутнасць культурна-гістарычнай памяці, на думку аўтара, зводзіцца перш за ўсё да такіх паняццяў, як «культура» і «спадчына», надзвычай шматгранных. Ад таго, як тлумачыцца іх змест, залежыць і само разуменне культурна-гістарычнай памяці. У дадзеным артыкуле аўтар прытрымліваецца прапанаванага Н. Ф. Дзянісавай і М. М. Браўчуком разгляду культуры як адзінства трох ключавых складнікаў («культура – гэта тое, што мы шануем»; «культура – гэта тое, што мы робім»; «культура – гэта тое, што мы памятаем»), захаванне якога дасягаецца падтрыманнем пераемнасці паміж пакаленнямі ў інтэрпрэтацыі гісторыі, не дапускаючы яе «перапісвання» [2, с. 22]. Наконт паняцця «спадчына» ў межах дадзенага артыкула да месца будзе прывесці словы французскага пісьменніка і культуролага А. Мальро, які дакладна прымеціў, што «спадчына – гэта пераўвасабленне, мінулае трэба адваяваць» [4, с. 255]. Такім чынам, менавіта гісторыя разглядаецца ў аспекце культуры, якая ў пэўнай меры і ёсць спадчына.

Такія высновы прыводзяць да вылучэння мэты дадзенага артыкула. Аўтар спрабуе разгледзець гістарычныя музеі Беларусі ў якасці прасторы па актуалізацыі культурна-гістарычнай памяці.

Умоўна ўсе гістарычныя музеі Беларусі можна размеркаваць па наступных падгрупах, вылучыўшы *агульнагістарычныя, ваенна-гістарычныя, гісторыка-мемарыяльныя, ваенна-мемарыяльныя, гарадскія гістарычныя, гісторыка-этнаграфічныя, гісторыка-архітэктурныя, рэлігійна-гістарычныя, гісторыка-археалагічныя і гісторыка-краязнаўчыя*. З аднаго боку, такі шырокі спектр дае шырокія магчымасці па вырашэнні пастаўленых мэт наконт актуалізацыі культурна-гістарычнай памяці з дапамогай музейных прадметаў праз гісторыю, краязнаўства, этнаграфію, рэлігію, архітэктуру, археалогію і г. д., а з іншага – патрабуе вылучыць менавіта навукова-даследчую дзейнасць як аснову для дзейснага функцыянавання гістарычных музеяў у якасці інстытутаў сацыякультурнай і гістарычнай памяці.

Актуалізацыя культурна-гістарычнай памяці адбываецца перш за ўсё праз рэпрэзентацыю гістарычных ведаў у аспекце пастаянных і часовых экспазіцый, пры праектаванні якіх галоўную ролю іграе навуковае даследаванне. Разуменне асноўнай ідэі і канкрэтнага зместу на першапачатковым этапе дазваляе ў будучым дасягнуць вырашэння пастаўленых адукацыйных і выхаваўчых задач. Асаблівае значэнне пры падрыхтоўцы экспазіцый надаецца вывучэнню і аналізу музейных калекцый, навуковай літаратуры і архіўных матэрыялаў, распрацоўцы дакументацыі. Вынікам удалага спалучэння навуковага працэсу са шматграннай мастацка-творчай дзейнасцю і электроннымі тэхналогіямі з'яўляецца стварэнне ілюзіі «пагружэння» наведвальніка ў прадметна-прасторавае музейнае асяроддзе [5, с. 129].

Расійская даследчыца Я. А. Варанцова, разглядаючы музей як базавы элемент інфармацыйнай інфраструктуры гістарычнай навукі, надае яму надзвычай важную ролю ў павелічэнні храналагічнай глыбіні сацыяльнай памяці і супрацьстаянні інфармацыйнай энтрапіі. Менавіта музей, на яе думку, выконвае функцыі інфармацыйнага рэсурсу і з'яўляецца месцам рэпрэзентацыі гістарычных ведаў і камунікацыі носьбіта ведаў (гісторыка, аўтара музейнай экспазіцыі) з суб'ектам, які спазнае (навучэнцам, неспецыялістам у галіне гісторыі) [1]. Пад

*рэпрэзентацыяй* маецца на ўвазе «прадстаўленне даследчыкам-гісторыкам – і шырэй, суб'ектам гістарычнага спазнання – свайго бачання гісторыі, у больш строгім сэнсе – бачання гістарычнага працэсу як выніку навуковага даследавання» [6, с. 17].

Варта заўважыць, што музейны прадмет у актуалізацыі культурна-гістарычнай спадчыны займае лідзіруючыя пазіцыі, але ён павінен разглядацца «ў якасці часткі агульнага, непарыўнага цэлага прыроды і культуры, у каштоўнасным кантэксце чалавечага быцця» [3, с. 454]. На гэта ўказвае вядомы расійскі філосаф і культуролаг М. С. Каган, разважаючы аб ролі навуковай функцыі музеяў. Даследчык падкрэслівае важнасць умелага спалучэння «рэчаведчай» («вещеведческой») скіраванасці з комплексным падыходам вывучэння музейнага прадмета ў кантэксце шырокай культурнай праблематыкі.

Аднак часцей на дадзены момант у гістарычных музеях Беларусі назіраецца трансфармацыя шляхоў развіцця ў бок іх дыгіталізацыі. На гэта звяртаюць увагу К. У. Сямашка і Г. А. Сівохін у артыкуле «Работа з гісторыка-культурнай спадчынай праз прызму ўвекавечання памяці пра загінулых як форма не/музейнага віду дзейнасці» [7]. Аўтары робяць акцэнт на стварэнні на базе класічных прадметных музеяў цэнтраў дакументацыі культурнай спадчыны, дзе асноўным аб'ектам вышуку, збору, даследавання і інтэрпрэтацыі музейнымі сродкамі, у тым ліку і публічнай прэзентацыі, становіцца не сам музейны прадмет – артэфакт, а пэўны дакумент, што да яго адсылае альбо сведчыць пра яго. У якасці прыкладу прыводзіцца Музей бітвы за Днепр, на базе якога ў 2019 г. быў створаны навукова-даследчы і адукацыйны праект «Цэнтр дакументацыі культурнай спадчыны».

У музеях Беларусі, як і ў большасці падобных культурных устаноў на тэрыторыі былога СССР, на працягу многіх дзесяцігоддзяў асноўным тыпам наведвальніка быў пасіўны атрымальнік гатовых ведаў і ўражанняў. У наш час наведвальнік жадае стаць паўнапраўным удзельнікам камунікатыўнага працэсу, адбіраючы патрэбную інфармацыю. Задача навуковых супрацоўнікаў гістарычных музеяў заключаецца ў тым, каб яе назапасіць і перадаць у выглядзе сацыяльна значных ведаў. Толькі тады гістарычны музей будзе разглядацца як самадастатковы цэнтр навукі, культуры і асветы.

Такім чынам, гістарычны музей і культурна-гістарычная памяць знаходзяцца ў цеснай сувязі і ўзаемаўплываюць адно на аднаго. Стрыжнем гістарычных музеяў з’яўляецца гісторыя, якая разглядаецца ў аспекце культуры, выступаючы ў ролі спадчыны. Актуалізацыя культурна-гістарычнай памяці адбываецца перш за ўсё праз рэпрэзентацыю гістарычных ведаў у аспекце пастаянных і часовых экспазіцый, пры праектаванні якіх галоўную ролю іграе навуковае даследаванне.

1. *Воронцова, Е. А.* Музей как базовый элемент информационной инфраструктуры исторической науки [Электронный ресурс] / Е. А. Воронцова // Рос. Об-во интеллектуальной истории: сайт // Диалог со временем. – 2014. – Вып. 49. – С. 163–189. – Режим доступа: https://roii.ru/r/1/49.9. – Дата доступа: 15.06.2021.

2. *Денисова, Н. Ф.* Историческая память белорусов: социологический анализ / Н. Ф. Денисова, Н. М. Бровчук // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2018. – Т. 63, № 1. – С. 21–32.

3. *Каган, М. С.* Музей в системе культуры / М. С. Каган // Вопросы искусствознания. – 1994. – № 4. – С. 445–460.

4. *Мальро, А.* Зеркало лимба / Андре Мальро ; пер. с фр. И. Кузнецова [и др.]. – М. : Прогресс, 1989. – 520 с.

5. *Навіцкая, В. В.* Навуковае даследаванне – аснова экспазіцыйнай дзейнасці беларускіх музеяў / В. В. Навіцкая // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2023. – № 1 (47). – С. 122–130.

6. *Румянцева, М. Ф.* Музейная экспозиция как форма репрезентации позиционирования актуального исторического знания: от постмодерна к постпостмодерну / М. Ф. Румянцева // Роль музеев в формировании исторического сознания : Междунар. науч.-практ. конф., Рязань, 25–28 апр. 2011 г.: материалы и доклады / отв. ред. И. В. Чувилова. – М., 2011. – С. 16–26.

7. *Сівохін, Г.* Работа з гісторыка-культурнай спадчынай праз прызму ўвекавечання памяці пра загінулых як форма не/музейнага віду дзейнасці [Электронны рэсурс] / Г. Сівохін, К. Сямашка // Дзяржаўная ўстанова культуры «Музей бітвы за Днепр» (Гомельская вобласць, Лоеў) // Культура & Антрапалогія. – 2021. – Рэжым доступу: http://loyev.museum.by/be/node/ 53669. – Дата доступу: 02.02.2021.